НАВІНКІ КНІГАВЫДАННЯ

# КНІГА ПРА ШКОЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ І НЕ ТОЛЬКІ




У пачатку 2016 года ў выдавецтве “Народная асвета” (Мінск) пабачыла свет новая кніга для дзяцей вядомай дзіцячай пісьменніцы з Гродна Ганны Скаржынскай-Савіцкай “Мішка-прывід”.

Разам з запрашэннем павандраваць па старонках кнігі пісьменніца прапануе акунуцца ў атмасферу школьнага жыцця. І не толькі. У кнізе шмат твораў, якія вучаць сяброўству; асвятляюць адносіны дзяцей з бацькамі, роднымі; прымушаюць задумацца над тым, што такое дабрыня, узаемадапамога, павага да іншых людзей.

У многіх апавяданнях гучыць гумарыстычная нотка, якая ўздыме настрой і падорыць юным чытачам прыемныя хвіліны.

Кніга Ганны Скаржынскай-Савіцкай “Мішка-прывід” адрасуецца дзецям сярэдняга школьнага ўзросту. Ілюстрацыі да кнігі выканаў мастак Яўген Шэвякоў. Яе наклад 1000 асобнікаў. Новае выданне для дзяцей ужо з’явілася ў кніжных крамах краіны.

**ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА**